***Плані́раваць*** — паступова, плаўна зніжацца пры палёце.
***Супярэ́чыць*** — пярэчыць, не згаджаючыся з кім-небудзь.
***Збажына́*** — агульная назва хлебных злакаў (жыта, пшаніца, ячмень).
***Калясні́ца*** — старажытная баявая і спартыўная павозка на двух колах.
***Партыза́н*** — асоба, якая вядзе ўзброеную барацьбу на тэрыторыі, акупаванай праціўнікам; удзельнік партызанскага атрада.



## УЛАДЗІМІР КАРАТКЕВІЧ

## Мая Беларусь

Наставіўшы белыя ветразі крылаў, плані́руюць буслы. Іх многія і многія тысячы. Гнёзды паўсюль. І таму мне здаецца, што зямлю нашу, Беларусь, можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі».

Чаму «Беларусь»? Ёсць некалькі варыянтаў паходжання гэтай назвы.

Першы: белыя адзенні даўніх вясковых людзей, белыя іхнія валасы, белы колер скуры.



Правообладатель Национальный институт образования

Другі. А ён аніяк не супярэчыць першаму. Калі на нашы старажытныя славянскія землі прыйшлі тата́ра-манголы — здолелі адбіцца ад іх амаль адны толькі мы. Мы — адбіліся. І менавіта таму мы «белая», «чыстая ад нашэсця татараў» Русь.

Якая яна, мая зямля? Гэта залатыя палі збажыны з сінімі вочкамі васількоў. Гэта светлыя ад бяроз гаі́, што аглухлі ад птушынага звону. Гэта пушчы, падобныя на храмы, пушчы, дзе горда нясуць свае кароны алені. Гэта бясконцыя рэкі, у якіх плешчуцца бабры і рыба на захадзе сонца. Гэта амаль адзінаццаць тысяч азёр, чыстых, як усмешка дзіцяці.

Гэта гераічная зямля. Безліч разоў, з пачатку дзён, грукаталі па ёй калясніцы вайны. Беларусь заўсёды мужна і да канца бараніла сваю праўду і веру.

Ёсць і горкая памяць у маёй зямлі. Дый як інačай, калі кожны трэці жыхар Беларусі загінуў у апошнюю вайну. Першай прыняла́ яна ўдар ворага і гераічна змагалася з ім... У лясах амаль чатырыста тысяч партызан цаною жыцця баранілі ад ворагаў Радзіму дзеля таго, каб зберагчы волю, веру, Ба́цькаўшчыну.

Пранікніцеся любоўю да маёй роднай Беларусі, дзеці. Велічная і гордая, яна таго вартая.

*Паводле Уладзіміра Караткевіча.*



Правообладатель Национальный институт образования

1. Пра што расказвае Уладзімір Караткевіч у апавяданні?
2. Чаму, на думку аўтара, Беларусь можна назваць «зямлёю пад белымі крыламі»?
3. Як пісьменнік тлумачыць паходжанне назвы нашай краіны? Знайдзіце адказ у тэксце і прачытайце.
4. Чаму аўтар называе Беларусь гераічнай зямлёю?
5. Патлумачце сэнс выразу «...грукаталі па ёй каляснiцы вайны».
6. Якая «горкая памяць» ёсць у нашай зямлі? Раскажыце, карыстаючыся словамі з тэксту.
7. Вызначце тэму і асноўную думку апавядання.

**Давайце абмяркуем.** Раскажыце, што цікавага вы бачылі, калі назіралі за паводзінамі буслоў. Чаму, на вашу думку, бусел з'яўляецца ўвасабленнем Беларусі?

## Творчае заданне

1. Разгледзьце малюнкі.









Правообладатель Национальный институт образования





2. Адкажыце на пытанні.

1) Дзе гуляла дзяўчынка Алеся?

2) Каго яна ўбачыла на лузе? Чым былі заняты Бусел, Васілёк і Лянок?

3) Аб чым яны спрачаліся?

4) Як Алеся памірыла герояў?

3. Складзіце невялікую казку па малюнках. Выкарыстайце апорныя словазлучэнні і сказы.

*Апорныя словазлучэнні і сказы:* на квяцістым лузе; убачыла Бусла, Васілька і Лянка; спрачаліся між сабою; пачула сварку; самы лепшы і прыгажэйшы на лузе; выступіў напы́шлівы Васілёк; у спрэчку ўступіў ганарлівы Лянок; усе выслухалі доказы Бусла; Алеся вырашыла прыпыніць спрэчку; усе вы прыгожыя і блізкія нам; усе сваім хараством упрыгожваеце наш луг.

4. Паразважайце, чаму можна павучыцца вам у Алесі.



Правообладатель Национальный институт образования